В.М. ЦЫНКЕВІЧ

# УСТАЛЯВАННЕ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ ЭКАНАМІЧНЫХ І ГАНДЛЁВЫХ СУВЯЗЯЎ У 1921–1922 гг.

Анализируется начальный период (1921–1922) белорусско-польских торгово-экономических связей, их становление и быстрый рост. Показана роль БССР как реэкспортера в Российскую Федерацию товаров из западных стран. Отмечено стремление властей республики сохранить под своим контролем основные экспортные отрасли.

The article analyses the first period of Belarusian (BSSR)-Polish trade and economic relations. This is the period of rapid growth of trade between the two states in the situation of absence of centralization of foreign trade that was characteristic of the Soviet Union at the end of 1920–1930. At that time BSSR played the role of a trade bridge between the West and Soviet Russia. The BSSR power leaders tried to control the main exporting fields of production, especially woodcutting.

Польшча разам з Латвіяй была для БССР першым замежным рынкам, які з'явіўся ў пачатку 1920-х гг., калі Рыжскі мір прынёс не толькі падзел беларускіх зямель, але і доўгачаканы мір і адносную стабільнасць. Яшчэ нядаўна адкрыты і ўбудаваны ў сусветную эканоміку гаспадарчы арганізм былой Расійскай імперыі, адроджаны ў пачатку 1920-х гг. у саюзе савецкіх рэспублік, тэрмінова патрабаваў аднаўлення гандлёвых сувязяў, перш за ўсё, з краінамі Заходняй Еўропы. БССР у першыя часы адыграла ролю плацдарма, з якога і пачалося аднаўленне знешняга гандлю.

Востры таварны голад, а таксама неабходнасць барацьбы з кантрабандай эканамічнымі метадамі (канкурэнцыя і паніжэнне цэн) дапамаглі даволі хуткаму развіццю прыгранічнага гандлю ў БССР.

Рыжскі дагавор шмат увагі надаваў свабодзе транзіту і мала – развіццю гандлёвых сувязяў[1]. Першы міждзяржаўны гандлёвы дагавор быў заключаны паміж Польшчай і СССР толькі ў 1938 г. Таму спачатку аднаўляліся гандлёвыя сувязі цалкам па ініцыятыве прыватных гандляроў як з польскага, так і беларускага боку. Гандаль пачаўся ўжо ў канцы 1920 г. пры пасрэдніцтве дробных контрагентаў на памежных станцыях. Цікава, што тавары з Польшчы прадаваліся нават на савецкія грошы, бо курс польскай валюты змяняўся хутчэй за савецкія рублі[2]. У нейтральнай паласе палякі гандлявалі па спецыяльных дазволах улад, савецкія – як прадстаўнікі Наркамата знешняга гандлю (НКЗГ). Міністр прамысловасці і гандлю Польшчы Р. Страсбургер у інтэрв'ю газеце "Кур'ер Варшаўскі" 8 красавіка 1921 г. паведаміў, што дзеля пашырэння гандлёвых кантактаў з СССР будуць адкрыты спецыяльныя пункты на польска-савецкай мяжы для безграшовага абмену тавараў[3]. У лютым 1922 г. колькасць абменных пунктаў для гандлю была павялічана. Па рашэнню эканамічнага камітэта Савета Міністраў Польшчы ад 18.11.1921 г. і загаду ваеннага міністра ад 25.11.1921 г. адмяняліся папярэднія абмежаванні і дазвалялася знаходжанне савецкіх грамадзян на польскай тэрыторыі на працягу сутак для гандлёвага абмену, ствараліся часовыя мытні, вызначаліся пункты пераходу граніцы[4].

Развіццё прыгранічнага гандлю і яшчэ ў большых памерах кантрабанды прывяло да ажыўлення эканомікі памежных раёнаў. У "Беларускіх ведамасьцях" за 19 верасня 1921 г. адзначалася, што на станцыі Аляхновічы прыгранічныя кааператывы вядуць вялікі гандаль з БССР – вывозяць мыла, соду, віно, гарэлку. Тое ж адбывалася ва ўсіх прыгранічных мястэчках.

У савецкіх рэспубліках існавала дзяржаўная манаполія на знешні гандаль, таму ўжо 02.05.1921 г. на пасяджэнні СНК БССР было прынята да ведама зацвярджэнне НКЗГ РСФСР кандыдатуры І. Цеўміна на пасаду ўпаўнаважанага НКЗГ РСФСР у БССР. Ён жа быў прызначаны наркомам знешняга гандлю БССР і прадстаўлены на зацвярджэнне ЦВК БССР[5]. На пасяджэнні ЦБ КПБ 15.06.1921 г. І. Цеўмін адзначыў, што першачарговымі задачамі

з'яўляюцца: выдзяленне 25 % экспартнага фонду, нарыхтаванага ў БССР, а таксама 6 млн р. золатам як абаротных сродкаў на патрэбы рэспублікі, дазвол саманарыхтовак лесу і іншых тавараў на экспарт, прызначэнне сваіх прадстаўнікоў за граніцу[6].

З ліпеня 1921 г. ва Упраўленне ўпаўнаважанага пачалі паступаць заяўкі наркаматаў БССР на імпарт тавараў, праўда, без усялякага фінансавага абгрунтавання. У канцы жніўня замежныя фірмы адкрылі крэдыт Упраўленню ўпаўнаважанага НКЗГ для імпартных паставак. Так, у фірмы "Брытаполь" у крэдыт заказалі пілы, сякеры, вагі, лапаты, хлор, каўстычную соду. Для кааперацыі Масквы запланавалі закуп за мяжой на 15 млрд р. Былі заключаны дагаворы аб нарыхтоўцы тавараў на экспарт: з Саўнаргасам БССР – на шчаціннe, з Упраўтопбелам – на лес, з Цэнтрабелсаюзам – на ільноволакно і кудзелю, нават з крамянчугскімі кустарамі з Украіны на пастаўку шчаціння на экспарт. Тавары на рэалізацыю даваў і НКЗГ з Масквы, прычым 50 % чыстага прыбытку ішло на нарыхтоўку новай сыравіны ў Беларусі, а 50 % – у Маскву, у касу Цэнтра. СНК БССР прыняў 23.07.1921 г. спецыяльную пастанову па пытаннях імпарту: закуп на мяжы тавараў па заданнях савецкіх і кааператыўных органаў павінен весціся толькі праз НКЗГ, усе канфіскаваныя кантрабандныя грузы паступалі ў распараджэнне наркамата. СНК хадайнічаў перад СНК РСФСР аб выдзяленні 3 млн золатам і на 3 млн тавараў для абаротных аперацый БССР і перадачы 25 % экспартных тавараў, якія знаходзяцца ў БССР у распараджэнні рэспубліканскіх улад[7].

Як дакладваў І. Цеўмін у НКЗГ 17.08.1921 г., упраўленне за першы месяц закупіла на граніцы тавараў на 3 млрд савецкіх рублёў. У Польшчы закупалі як тавары для прамысловасці – дубільны экстракт, казеін, альбумін, так і тавары шырокага побыту, якія пасля рэалізаваліся на вольным рынку па заніжаных на 30 % цэнах[8]. І. Цеўмін у тэлеграме ў СНК і НКЗГ РСФСР 15.09.1921 г. дакладваў, што для патрэб Беларусі ўпраўленнем закуплена тавараў на 12 246 млн р.

Хутка былі навязаны непасрэдныя кантакты з польскімі фірмамі. З верасня 1921 г. усталявалася сувязь з акцыянерным таварыствам "Брытаполь", у Мінску адкрылася гандлёвае прадстаўніцтва польска-амерыканскага акцыянернага таварыства "Палатайн". Праз гэтыя фірмы Белзнешгандаль імпартаваў з Польшчы тавары і прадаваў іх дзяржаўным установам і кааператыўным арганізацыям. З-за адсутнасці абаротных сродкаў гандаль вёўся ў крэдыт, польскія фірмы далі крэдытаў Белзнешгандлю ў 1921 г. на 70 тыс. залатых рублёў. Трэба адзначыць, што за другую палову 1921 г. адмоўнае сальда знешняга гандлю Белзнешгандлю склала 72 тыс. залатых рублёў[9]. За гэта апарат Упраўлення ўпаўнаважанага НКЗГ па БССР быў рэзка пакрытыкаваны маскоўскім кіраўніцтвам. На абвінавачванні ўпаўнаважаны НКЗГ адказваў, што ўведзеныя з 1922 г. мытныя пошліны занадта вялікія і складаюць, напрыклад, на сахарын 230 % ад кошту, парафін – 200 % ад кошту, таму выраслі цэны на імпарт і павялічылася кантрабанда[10].

Такім чынам, спроба перамагчы кантрабанду эканамічнымі метадамі не атрымалася; яе змяншэнне пачалося толькі ў 1924–1925 гг. з узмацненнем аховы мяжы[11].

6 мая 1922 г. быў заключаны дагавор Белзнешгандлю з акцыянерным таварыствам "Палатайн", паводле якога апошняе атрымлівала права на ўвоз тавараў з-за мяжы на працягу паўгода на 1 млн залатых рублёў і вываз сыравіны на такую ж суму. Белзнешгандаль атрымліваў 25 % кошту ад імпартных і экспартных аперацый, што дало прыбытак у 432 тыс. залатых рублёў[12]. З прапановай заключэння аналагічнага дагавора звярталася да беларускіх улад і данцыгская фірма "Дава" ("Дойче альгемайне варен акціенгезелшафт")[13]. Дагавор НКЗГ РСФСР і таварыстваў "Дава" і "Брытаполь" на ўвоз тавараў быў заключаны 11.10.1922 г. па раней зацверджаным спісам і з

атрыманнем адпаведных ліцэнзій на суму не менш чым 6 млн залатых рублёў як імпарту, так і экспарту. Паводле дагавора адкрывалася сумеснае аддзяленне фірм у Мінску[14], якое вяло продаж імпартных тавараў і скупку за наяўны разлік і ў абмен на імпартныя тавары пушніны, шчаціння, ільну і г. д.[15], але адносіны з польскімі фірмамі не былі беспраблемнымі. У 1923 г. Дзяржгандальбел* праз Вышэйшы суд БССР дамагаўся выплаты "Палатайнам" пазыкі на 11 319 р. золатам і "Брытаполем" у Маскоўскім губернскім судзе – на 794 дол. ЗША[16]. Адзначаны дагавор з "Палатайнам" не быў выкананы апошнім – таварыства ўвязло тавараў на 1 млн р., а вывезла – толькі на 528 тыс. і было вымушана заплаціць 5 % няўстойкі[17].

За 1921–1922 гг. беларускі знешні гандаль прайшоў свой першы этап развіцця: была наладжана нарыхтоўка экспартных тавараў, узніклі сувязі з адносна буйнымі замежнымі фірмамі, перш за ўсё польскімі. З'явілася патрэба выходзіць на сувязі з непасрэднымі вытворцамі прадукцыі альбо скарачаць колькасць пасрэднікаў.

На пасяджэнні Савета знешняга гандлю пры НКЗГ БССР 19.01.1922 г. разглядалася пытанне эфектыўнай арганізацыі імпарту з-за мяжы. Было вырашана "ўзмацніць працу" адзінага на той час прадстаўніка НКЗГ БССР за мяжой (у Варшаве) – Штэрна[18], які некаторы час працаваў у складзе гандлёвага прадстаўніцтва СССР, але пазней пасада была скарочана з-за пераарыентацыі беларускага экспарту і імпарту на Германію і іншыя краіны Заходняй Еўропы. У справаздачы "Внешняя торговля Белоруссии в 1923–1924 хозяйственном году" адзначалася: "Прадстаўніцтва ў Варшаве было незадоўга да гэтага (да пачатку гаспадарчага года. – *Ц. В.*) ліквідавана, бо экспарт наш у Польшчу ўвесь час быў вельмі невялікі і відаў на развіццё не мае". "Імпартныя ж заказы Дзяржгандальбела займалі ў дзейнасці гандлёвага прадстаўніцтва ў Варшаве дамінуючае становішча, даючы яму асноўнае ўтрыманне, і існаванне асобага прадстаўніцтва Дзяржгандальбела заўважальнай карысці не прыносіла"[19]. (Тут і далей пераклад аўтара. – *Ц. В.*)

У далейшым гандаль з Польшчай праходзіў праз гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Варшаве, якое працавала ў гэты час па імпарту пераважна на заказы з БССР[20]. Амаль усе тавары на рэалізацыю ў Польшчы паступалі ад Дзяржгандальбела[21]. Акрамя таго, некаторы час у Стоўбцах знаходзілася Агенцтва гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Польшчы.

Паводле статыстычных дадзеных, гандаль з Польшчай у 1922/23 гаспадарчым годзе складаў 64,9 % ад усяго экспарту і 72,4 – ад імпарту БССР, у 1923/24 г. – 9,4 і 58,6 %, у 1924/25 – 4,0 і 31,2 % адпаведна[22]. У Польшчу з БССР вывозілася сыравіна і прадукцыя жывёлагадоўлі, прычым толькі невялікая частка яе пераапрацоўвалася на прадпрыемствах Польшчы. Астатняе, асабліва прадукты сельскай гаспадаркі, перапрадавалася палякамі далей на Захад[23], што было нявыгадна, таму экспарт БССР даволі хутка быў перанакіраваны на Германію, Англію. У 1922 г. закупілі 4 тыс. плугоў у польскіх фірм "Сталь" і "Завадскі". Цікава, што БССР вымушана была завозіць з Польшчы беларускія кнігі яшчэ ў 1922 г. і таму Прэзідыум ЦВК БССР 04.08.1922 г. разглядаў пытанне аб зняцці пошлін з кніг, прывезеных у Мінск выдаўцом з Вільні Клецкіным (вырашылі зняць пошліну толькі з кніг на беларускай мове)[24].

Добрыя кантакты з польскімі гандлярамі і адсутнасць іх з вытворцамі краін Заходняй Еўропы, хуткая і бесперабойная, у адрозненне ад Германіі, дастаўка тавараў з Польшчы сталі прычынай больш працяглай арыентацыі БССР на імпарт з Польшчы. Спецыялістамі адзначаліся гэткія недахопы ў арганізацыі знешняга гандлю БССР, як адсутнасць інфармацыі аб рынках, доўгія тэрміны дастаўкі тавара да месца прызначэння (1–2 месяцы), марудная рэалізацыя тавара, адсутнасць інфармацыі аб прададзеных таварах,

* Створаны 01.06.1922 г. пры Упраўленні ўпаўнаважанага НКЗГ, поўная назва – Дзяржаўная экспартна-імпартная гандлёвая кантора.

продаж іх часткі ніжэй сабекошту, дрэнная якасць экспартнага тавару, слабая дзейнасць прадстаўнікоў Дзяржгандальбела ў Варшаве і Берліне[25].

Неаднаразова ўзнікалі таксама супярэчнасці экспартных інтарэсаў БССР і мытна-тарыфнай палітыкі СССР (РСФСР). Зацверджаны 13.06.1922 г. СНК РСФСР першы экспартны тарыф меў забарону на вываз хлеба, грыбоў, масла, яек, птушкі і іншых прадуктаў харчавання. Гэтыя абмежаванні, а таксама пошліны на вываз дзёгцю, шкіпінару, пянькі былі зняты новым тарыфам ад 06.03.1923 г. – зніжаны пошліны на лес і лён, але адначасова ўводзіліся пошліны на вываз кішак, скур, ануч (1 р. з пуда)[26].

За кантроль над лепшай экспартнай галіной прамысловасці БССР – лясной і дрэваапрацоўчай – доўгі час ішла барацьба паміж Масквой і Мінскам. Яшчэ ў час мірных перагавораў у Рызе Польшча падняла пытанне аб выдзяленні ёй лясных канцэсій на тэрыторыі БССР. Супраць гэтага рэзка выступіла кіраўніцтва рэспублікі: Г.В. Чычэрын 22.01.1921 г. паведамляў у Рыгу С.С. Іофэ: "Червяков сообщает относительно плана дать лесные концессии полякам в Белоруссии. Лесные массивы республики истощены в результате войны. Это единственное богатство края. Потребность в древесине громадная, ее получают из Белоруссии также Украина и Донбасс для шахт. Концессионеры помешают советскому строительству Белоруссии. Контакт с поляками придал бы им особенное отрицательное политическое значение. Передача лесов концессионерам вызовет злостную агитацию против нас, подорвет авторитет Соввласти. Уже теперь белорусское крестьянство этим сильно озабочено, слухи распространяются.

Ввиду этих соображений ставим вам предварительный вопрос, нельзя ли отвести полякам лесные концессии в другой местности, ведь все равно концессии они перепродадут. Можно сослаться на истощение лесов в Белоруссии и на необходимость дать им отдохнуть. Нельзя ли предложить лесные концессии полякам в отдаленных губерниях, например Архангельской, Вологодской"[27]. У выніку пытанне было знята з абмеркавання.

Нягледзячы на вычарпанасць лясных рэсурсаў БССР у выніку бессістэмнага карыстання ў часы Першай сусветнай і Грамадзянскай войн, яны заставаліся вельмі каштоўным экспартным рэсурсам, у першую чаргу, з-за выгаднага размяшчэння недалёка ад межаў і наяўнасці сеткі наземных і водных шляхоў (у адрозненне ад лясоў РСФСР). У Маскве ў 1921 г. узнік план прыватнай канцэсіі для распрацоўкі лесу паміж рэкамі Случ і Пціч. Улады БССР выступілі рэзка супраць яго, тады было вырашана стварыць трэст "Захадалес", арыентаваны толькі на экспарт лесу і падпарадкаваны не беларускім, а непасрэдна маскоўскім органам улады[28]. За трэстам "Захадалес" былі замацаваны лепшыя лясы БССР. Працу пачалі з пачатку 1922 г., але спробы наладзіць рэгулярны сплаў лесу на экспарт праз тэрыторыю Польшчы амаль праваліліся. На "Захадалес" у 1922/23 гаспадарчым годзе прыходзілася каля 20 % савецкага экспарту лесу. Але распрацоўка лясоў Поўначы і рост яго вывазу праз Ленінград і Архангельск, настойлівыя спробы беларускіх рэспубліканскіх улад узяць трэст пад свой кантроль прывялі да зліцця 01.05.1924 г. "Захадалеса" з трэстам "Лесбел", які быў створаны 01.04.1922 г. як дзяржаўнае аб'яднанне лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці БССР і не меў права экспарту лесу за мяжу. З гэтага часу трэст "Лесбел" канцэнтруе ў сваіх руках экспарт лесу за мяжу, але ён вывозіцца не ў Польшчу, а далей на Захад – у Германію, Англію.

Перагаворы аб распрацоўцы лясных участкаў на паях з "Захадалесам", якія вялі польскія фірмы "Палатайн" і "Якаў Цырынскі" ў пачатку 1920-х гг., скончыліся безвынікова.

Пасля падпісання Рыжскага міру афіцыйныя ўлады Польшчы нават спрабавалі правесці перагаворы аб заключэнні гандлёвага дагавора[29] з БССР. У пачатку 1922 г. кіраўніцтву БССР напаўафіцыйна стала вядома, што палкоўнік Клім – старшыня польскай дэлегацыі ў ваенна-пагадняльнай камісіі

(змешаная камісія па ліквідацыі паграгічных інцыдэнтаў) – мае паўнамоцтвы ад МЗС Польшчы на вядзенне перагавораў аб заключэнні польска-беларускага гандлёвага дагавора. На жаль, дакладна невядома, ці дайшла справа да канкрэтных прапаноў з польскага боку[30].

Такім чынам, разглядаемы перыяд у беларуска-польскіх гандлёва-эканамічных сувязях можна адзначыць як этап станаўлення і бурнага росту гандлю з Польшчай, калі БССР адыграла нават ролю рээкспарцёра тавараў з Польшчы далей на Усход. У той жа час БССР і Польшча выступалі як канкурэнты на сусветным рынку лесу і лесапрадуктаў, сельгаспрадукцыі.

[1] Штейн Б.Е. Внешняя торговая политика СССР. М.; Л., 1925. С. 26.
[2] Теумин И. К итогам работ в областной организации внешней торговли Белоруссии (за время с 1 июля 1921 г. по 1 мая 1922 г.) // Народное хозяйство Белоруссии. 1922. № 2-3. С. 17.
[3] Polsko-radzieckie stosunki gospodarcze. Dokumenty i materialy. 1921–1939. Warszawa, 1976. S. 51.
[4] Лечик М. Торгово-экономические отношения между Польшей и СССР // Очерки истории советско-польских отношений. 1917–1977. М., 1979. С. 182.
[5] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НА РБ). Ф. 15. Воп. 1. Спр. 2. Л. 5.
[6] Там жа. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 4. Л. 113.
[7] Советская Белоруссия. Мн., 1921. С. 85–86.
[8] Экономические отношения Советской России с будущими союзными республиками. 1917–1922. Документы и материалы. М., 1996. С. 229–231.
[9] Кравченко П.К. Внешняя торговля БССР в период восстановления народного хозяйства (1921–1925 гг.) // Вопросы истории СССР и БССР: Межвуз. сб. Мн., 1975. Вып. 2. С. 136.
[10] Теумин И. Указ. тв. С. 19.
[11] Дзейнасць ураду БССР за 1926–27 год. Менск, 1928. С. 331.
[12] Кравченко П.К. Внешняя торговля... С. 139.
[13] Бягучы архіў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (далей – бягучы архіў МЗС РБ). Ф. 3. Спр. 20. Л. 4.
[14] НА РБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 203. Л. 2.
[15] Вся Белоруссия. Адресно-справочная книга и календарь на 1923 год. Мн., 1923. С. 2.
[16] НА РБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 100. Л. 16.
[17] Гармизе Н.Л. Внешняя торговля в Белоруссии (Обзор деятельности Госторгбела и НКВТ Белоруссии) // Советское строительство Белорусской Советской Социалистической Республики. 1925. № 8-9. С. 77–82.
[18] НА РБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 112. Л. 4.
[19] Внешняя торговля Белоруссии в 1923–1924 хозяйственном году. Мн., 1925. С. 6.
[20] Внешняя торговля. 1923. № 44. С. 16.
[21] Внешняя торговля. 1923. № 29. С. 20.
[22] Кравченко П.К. Экономические и культурные связи БССР с зарубежными странами (1921–1932 гг.): Дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1976. С. 69.
[23] Теумин И. Объединение Западной области с точки зрения внешней торговли // Народное хозяйство Белоруссии. 1922. № 2-3. С. 42.
[24] НА РБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 90. Л. 14.
[25] Гармизе Н. Л. Указ. тв. С. 77–82.
[26] Внешняя торговля. 1923. 2 апр. С. 4.
[27] Польско-советская война 1919–1920: Ранее не опубликованные документы и материалы. М., 1994. С. 185–186.
[28] Советская Белоруссия. Мн., 1921. С. 174.
[29] Бягучы архіў МЗС РБ. Ф. 3. Спр. 20. Л. 4.
[30] НА РБ. Ф. 15. Воп. 1. Спр. 35. Л. 74.

Паступіў у рэдакцыю 14.03.2003.

*Валерый Міхайлавіч Цынкевіч* – аспірант кафедры міжнародных адносін. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар М.Э. Часноўскі.

*О.В. ШИЛАЙ*

## ИССЛЕДОВАНИЕ СРЕДНЕВЕКОВЫХ НАРРАТИВНЫХ ИСТОЧНИКОВ МЕТОДОМ СТРУКТУРНОГО АНАЛИЗА

Исследуется метод структурного анализа таких нарративных источников, как средневековые латинские видения. В результате показывается развитие топографической картины загробного мира и происхождение чистилища.

The article deals with the method of structural analysis of such narrative sources as medieval Latin visions. As a result of the research the author shows dynamics of shaping a topographical picture of the Other World and the origin of purgatory.